# Класіка гучыць

ТАЦЦЯНА МАСТОЎСКАЯ

**Творы Якуба Коласа і Янкі Купалы прачыталі разам студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы, кадэты і вучні гродзенскіх школ і гімназій. Чарговая імпрэза абласной акцыі "Чытаем разам" была прымеркавана да Дня беларускага пісьменства.**



ФОТА ТАЦЦЯНЫ БАЯРЧУК

У літаратурную гасцёўню, што адчыніла свае дзверы ў абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага, завіталі, каб пачытаць і паслухаць творы выбітных беларускіх пісьменнікаў, начальнік упраўлення адукацыі Аляксандр Сонгін і намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Вячаслаў Апановіч.

– *Гэта акцыя робіць карысную справу: мы разам бяром добрую кнігу і чытаем тыя творы, якія любілі ў дзяцінстве, якія прыводзяць нас, ужо дарослых, да нейкіх думак, пошукаў, бяром тыя кнігі, якія мы перачытваем і з узростам асэнсоўваем па-іншаму*, – адзначыў Аляксандр Сонгін. – *Калі рыхтаваўся да імпрэзы, падумаў, што ўсё маё жыццё звязана з кнігай. І не толькі таму, што я настаўнік па адукацыі, працаваў у пачатковых класах, пасля выкладаў гісторыю. Мая маці не адзін дзясятак гадоў працавала і працуе сёння бібліятэкарам у школе. З кнігамі я знаёмы з самага дзяцінства і ўсё жыццё чытаю. Люблю не толькі класіку беларускай літаратуры, але і сусветную. Сёння ў мяне на паліцы некалькі кніг. Гэта Дзюма "Тры мушкецёры", "Фінансавая дыета памочніка Прэзідэнта Кірыла Рудага, не забываю пра Біблію.*

Выбраў Аляксандр Генрыхавіч для прачытання вядомы, у тым ліку і як песня, твор "Мая малітва" Янкі Купалы. Вячаслаў Апановіч прачытаў знаёмы нам са школы ўрывак "Раніца ў нядзельку" з паэмы "Новая зямля" Якуба Коласа. На працягу гадзіны ў Новым замку гучала мілагучная мова і знаёмыя (а часам і ніколі раней не чутыя) радкі класікаў. У заканчэнне імпрэзы прысутныя гучным хорам прачыталі вершы "Не шукай" і "Родныя вобразы".

Абласная акцыя "Чытаем разам" прайшла ўжо ў чацвёрты раз. Раней паважаныя госці і школьнікі чыталі творы Элізы Ажэшкі, Кандрата Крапівы, а таксама прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Неўзабаве літаратурная гасцёўня зноў пакліча аматараў роднай літаратуры: у канцы верасня будзем чытаць Максіма Багдановіча.